# ГРАМАДСКІ СЕКТАР У БЕЛАРУСІ –
# ПАЎСЯДЗЁННАЕ ЖЫЦЦЁ І АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ

Віталь Сіліцкі

## АГУЛЬНЫЯ ЗАЎВАГІ

Аўтару гэтага артыкулу было прапанавана прааналізаваць дадзеныя даследавання беларускіх недзяржаўных арганізацый (НДА), якое праводзілася з мэтай пошуку шляхоў падвышэння эфектыўнасці грамадскага сектару як чынніка дэмакратызацыі Беларусі. Ініцыятарамі даследавання была праведзена грунтоўная аналітычная праца, вынікам якой сталі дадзеныя нацыянальнага апытання больш за 400 беларускіх НДА і некалькі дзесяткаў глыбінных інтэрвью з лідэрамі неўрадавага сектару. Факталагічны матэрыял дае падставы для грунтоўных высноваў, хоць ў той жа час трэба адзначыць, што "адарванасць" аналітыка фінальнага прадукту ад распрацоўкі даследавання стварае сітуацыю, калі аўтар быў "уціснуты" ў бачанне і гіпотэзы, вызначаныя замоўцамі, і якое ён не заўжды падзяляе. Таму адразу неабходна спыніцца на двух істотных абмежаваннях, якія ініцыятары даследавання заклалі ў яго, і якое абмяжоўвае спектр прадукавання аўтарам магчымых адказаў.

Па-першае, каб зразумець шляхі падвышэння эфектыўнасці грамадзянскай супольнасці як чынніка дэмакратызацыі, трэба мець грунтоўны тэарэтычны падмурак, на аснове якога было б выпрацавана бачанне, якім чынам грамадзянская супольнасць уплывае на ход дэмакратызацыі ўвогуле (не трэба блытаць з менш кантраверсійным пытаннем пра ролю грамадзянскай супольнасці ў кансалідацыі існуючай дэмакратыі). Трэба зазначыць, што сярод тэарэтыкаў (палітолагаў, аналітыкаў, сацыёлагаў, філосаваў і інш.) і "практыкаў" (палітыкаў, грамадскіх актывістаў, мэнэджэраў НДА і інш.) адсутнічае кансэнсус наконт гэтага пытання. У прыватнасці, шэраг "працэсуальных" тэорыяў дэмакратызацыі, якія сцвярджаюць, што дэмакратычны транзіт – гэта справа "элітных гульняў"[1], прыводзяць да высновы, што грамадзянская супольнасць з'яўляецца хутчэй вынікам, чым чыннікам палітычных пераменаў. Гэтую думку лепш за ўсіх сфармуляваў беларускі аналітык Юры Дракахруст падчас канферэнцыі "Да новага бачання Беларусі" ў верасні 2007 года: "Ніякія тэхналягічныя ці ідэалягічныя прапановы тых самых інтэлектуалаў, будзь яны рэалізаваныя самым дасканалым чынам, не маглі б істотна змяніць ані вагу апазыцыі, ані сітуацыю ў грамадстве ў цэлым у кароткатэрміновым перыядзе…. Дастаткова таго, што апазіцыя неяк варушыцца, барахтаецца, брыкаецца – гэта візуальны вобраз існавання альтэрнатывы. Гэта мінімум, але і максімум адначасна… Ад якасці апазіцыі не залежыць, калі адбудзецца змена рэжыму. Ад гэтай якасці залежаць формы, у якіх адбудзецца змена (чым ніжэй якасць – тым большая імавернасць крывавага пераходу), а самае галоўнае – ад якасці апазіцыі залежыць тое, што будзе пасля змены (нават калі сённяшняя апазіцыя і ня будзе адыгрываць тады галоўную ролю).[2]

Іншымі словамі, у межах гэтага погляду пра падвышэнне эфектыўнасці грамадзянскай супольнасці ва ўмовах жорсткага аўтарытарызму спадзявацца не прыходзіцца. Можна казаць толькі пра тое, як падтрымаць яе існаванне да моманту, калі рэжым разваліцца, бо ў самім факце яе існавання ёсць самадастатковая вартасць.

---

[1] Класічным прыкладам "элітнай" тэорыі дэмакратызацыі з'яўляецца Guillermo O'Donnel, Philippe S. Schmitter, and Lawrence Whitehead, *Transitions from Authoritarian Rule*. Baltimore: Johns Hopkins University Press, 1985.

[2] Цытуецца па рукапісу, які прадстаўлены аўтару.

Другі погляд на грамадзянскую супольнасць заключаецца ў тым, што менавіта яна ёсць тым самым чыннікам пераменаў і іх "арганізатарам і натхняльнікам". Гэты пункт гледжання набыў асаблівую папулярнасць пасля "аксамітавых" і "каляровых" рэвалюцый у рэгіёне, у якіх вызначальную ролю як быццам бы гулялі грамадзянскія рухі.[3] Даследаванне Freedom House "Як перамагла свабода: ад грамадзянскага супраціву да ўстойлівай дэмакратыі" паказала, што сапраўды большасць дэмакратычных трансфармацыяў былі "некааператыўнымі", то бок, яны былі справакаваныя моцнымі грамадзянскімі рухамі, якія кідалі выклік аўтарытарнай уладзе, а не былі выкліканыя "элітнымі" гульнямі і пактамі.[4] Аднак, такая з'ява, як грамадзянскі рух сама па сабе вельмі аморфная, таму што ў ім пераплятаецца (а часамі блытаецца) цэлы шэраг дзеячоў – НДА, палітычныя партыі, прыватны бізнэс, цэрквы і г. д. Грамадзянская супольнасць як рухавік пераменаў – гэта не столькі перадавы атрад НДА сектару, колькі прадстаўнік усёй нацыі, прычым гэты стан дасягаецца тады, калі грамадзянскую супольнасць і яе памкненні легітымізуюць іншыя структуры, часцяком іерархічныя (як было ў Польшчы, дзе рух Салідарнасці падтрымліваўся сімвалічным капіталам і маральным аўтарытэтам каталіцкай царквы). Без такой падтрымкі, без апоры на больш шырокі спектр інстытутаў, без апеляцыі да больш разнастайнага набору каштоўнасцяў і сімвалаў, грамадзянская супольнасць – гэта хутчэй субкультура палітычнай меншасці, якой яна, дарэчы і ёсць у Беларусі. Такая субкультура можа быць вельмі моцным чыннікам пераменаў, калі вонкавыя адносна яе фактары (такія, як знешні ўсціск ці ўнутраная эрозія рэжыму) адчыняць акно магчымасцяў для пераменаў. Але яна наўрадці здолее сама прарубіць яго ўласнымі высілкамі, як гэта зрабіла ў свой час тая ж "Салідарнасць".

Трэба адзначыць таксама, што роля НДА сектару ў даследаваннях працэсаў дэмакратызацыі час ад часу перабольшваецца як сродак прамоцыі вынікаў уласнай працы – такія даследаванні часцяком пішуцца грамадзянскімі актывістамі і (ці) донарамі. Адносна "нейтральныя" назіральнікі паказываюць больш складаныя ўзаемасувязі паміж дынамікай дэмакратычнай трансфармацыі і роляй у ёй грамадзянскай супольнасці. У межах гэтага падыходу, грамадзянская супольнасць таксама мае самадастатковую каштоўнасць для дэмакратычнай будучыні, але да яе ўжо прад'яўляюцца пэўныя патрабаванні што да яе стратэгіі, тактыкі, арганізацыйнай устойлівасці і г.д.

Трэба зазначыць, што пад час панавання аўтарытарнага рэжыму грамадскі сектар і яго шэраговыя ўдзельнікі знаходзяцца пад "полагам невядомасці" адносна перспектываў беларускага грамадства. Яны вымушаны выслухваць доўгія разважанні пра тое, чаму іх краіна можа быць "не гатовай" да дэмакратыі. Яны адчуваюць на сабе ціск дзяржаўнага рэпрэсіўнага апарату і адначасова сутыкаюцца з расчараваннем і канфармізмам, якія распаўсюджваюцца нават на сацыяльна актыўных людзей. Сам па сабе працэс выхаду з аўтарытарызму, яго час і дынаміка, кантэкст і перадумовы, застаюцца пад такім жа полагам невядомасці. Таму любы адказ на пытанне, да чаго прыкласці высілкі, каб найлепш паспрыяць працэсам змены рэжыму і дэмакратызацыі ў той час, калі яны пачнуцца, будзе даволі адвольным і малаабгрунтаваным. На думку аўтара, у абсяжнай зроку перспектыве асноўным клопатам грамадскіх актывістаў будзе самавыжыванне і "падтрыманне агню," захаванне ў дадзенай супольнасці саміх прынцыпаў грамадзянскасці, што дае надзею, што акно магчымасцяў, калі яно адчыніцца, будзе выкарыстана адпаведным чынам.

---

[3] З апошніх публікацый, найбольш грунтоўна гэтая думка раскрываецца ў кнізе Pavol Demeš , Joerg Forbrig, Robin Shepherd, *Reclaiming Democracy: Civil Society and Electoral Change in Central and Eastern Europe* (Bratislava: German Marshall Fund, 2007)/

[4] http://www.freedomhouse.org/uploads/special_report/29.pdf

Такім чынам, аўтар шукае адказ на пытанне, як грамадзянская супольнасць у Беларусі можа паўплываць на дэмакратычныя перамены ў грамадстве менавіта **ў рэчышчы ідэі пра самакаштоўнасць грамадзянскай супольнасці як "захавальніка агню", носьбіта адмысловага духу, досведу, каштоўнасцяў і капіталу, якія пры спрыяльных абставінах скаталізуюць гэтыя перамены.** Прычынамі такога падыхода з'яўляюцца наступныя меркаванні:

- Дэмакратычныя перамены ў кароткачасовай перспектыве не падаюцца магчымымі
- Незалежная грамадзянская актыўнасць у сучаснай Беларусі гэта выразна субкультурная з'ява ў рамках грамадства, якое знаходзіцца ў шчыльным кантракце з дзяржавай.
- У Беларусі пачаліся працэсы размывання старой аўтарытарнай сістэмы, што дае падставы чакаць пэўныя змены ў палітыцы і эканоміцы. Аднак, ва ўмовах сацыяльнай апатыі і палітычнага кантролю, патэнцыял гэтых зменаў досыць абмежаваны, і яго мяжой стане некаторае пашырэнне ступені свабоды ў беларускім грамадстве і пэўная дэзарганізацыя ўладнага апарату.
- У доўгатэрміновай перспектыве працэсы эрозіі, аднак, могуць адчыніць тое самае акно магчымасцяў для пераменаў, пра якое казалася вышэй. Аднак тыя ж самыя працэсы могуць вызваць контррэакцыю ў кароткачасовай перспектыве: спробы "наладзіць" трохі расківаную сістэму могуць прывесці да новага раўнду рэпрэсіяў і пераследу.

У гэтых умовах, на парадку дня грамадзянскай супольнасці галоўнымі пунктамі з'яўляюцца **самавыжыванне і пашырэнне "зоны свабоды" ў несвабодным грамадстве, павялічэнне свайго ўплыву ў рамках іерархізаванага "мэйнстрыму", а таксама сэнсоўная падрыхтоўка пераменаў, стварэнне інтэлектуальных альтэрнатываў, генерацыя новых бачанняў** (дадзены спектр пытанняў, на жаль, выходзіць за рамкі гэтага даследавання).

Але перад тым, як перайсці да аналізу дадзеных, трэба выказаць яшчэ некалькі метадалагічных заўвагаў. У літаратуры па праблеме існуе выразны падзел на "грамадзянскую супольнасць 1" ("траваядны" НДА-сектар, які накіраваны на самаарганізацыю грамадзянаў для вырашэння іх праблемаў і прадастаўлення паслугаў) і "грамадзянскую супольнасць 2" ("платаядны" НДА-сектар, арыентаваны на палітычную і маральную канфрантацыю з аўтарытарнай уладай.[5] Пытанне што да такога падзелу простае – ці мусім мы спадзявацца на тое, што клубы аматараў кошак справакуюць дэмакратычную рэвалюцыю. Як гэта ні парадаксальна, але станоўчы адказ мае права на існаванне. У залежнасці ад адказу на пытанне тут могуць нараджацца дыяметральна супрацьлеглыя рэкамендацыі. Калі грамадзянская супольнасць працуе выключна "на перспектыву", то дэмакратычнай будучыні спрыяе ўсё, што развівае пэўныя навыкі грамадзянскай актыўнасці і "сардэчныя звычкі" адказнага і неабыякавага грамадзяніна. У выпадку ж, калі грамадзянская супольнасць мусіць быць не толькі актыўнай, але і ваяўнічай, яна вымушана рабіць тое, што "траваядны" НДА-сектар мусіць пазбягаць па азначэнні. "Траваядная" грамадзянская супольнасць робіць акцэнт на "мадэрнізацыйна-эвалюцыйны" шлях да дэмакратыі. Ён палягае праз падвышэнне ўзроўня жыцця і павялічэнне сацыяльнага капіталу, неабходнага для функцыянавання дэмакратыі. Аднак такая грамадская дзейнасць рызыкуе ператварыцца калі не ў дабраахвотную цімураўскую дружыну ў справе ўмацавання аўтарытарнай улады, то ў свайго роду дадатак да агульнадзяржаўнай сістэмы сацыяльнага забеспячэння. З іншага боку, "платаядныя" НДА без наяўнай сітуацыі зменаў, як паказывае практыка, хутка губляюць імпэт і дэзарыентуюцца.

---

[5] **Foley, Michael W. Edwards, Bob.** *The Paradox of Civil Society* Journal of Democracy - Volume 7, Number 3, July 1996, pp. 38-52

Гэтыя тэарэтычныя меркаванні павадуюць і метадалагічныя заўвагі. Перад аўтарам пастаўлена пытанне пра эфекыўнасць усяго грамадзянскага сектару, у той час, як арганізацыйныя місіі, стратэгіі і г.д. будуюцца на ўзроўні асобнай арганізацыі. Таму аналізаваць эфектыўнасць сектару праз прызму арганізацый – гэта прыкладна тое ж самае, што спрабаваць прааналізаваць эфектыўнасць рынку праз прызму бізнэс-стратэгій фірмаў. Апошнія будуць сябе паводзіць цалкам рацыянальна, а сам рынак можа быць суцэльна недасканалым. Прынамсі немагчыма аналізаваць сектар у адрыве ад інстытутаў і правілаў гульні. Аднак, менавіта ў такім метадалагічным індывідуалізме задання закладзеная пэўная гіпотэза: праблемы грамадзянскай супольнасці ў Беларусі ў першую чаргу – арганізацыйныя. Часткова такое бачанне – гэта адказ на крытыку грамадскага сектару з боку шматлікіх назіральнікаў і нават донараў, якія ўсё часцей абвінавачваюць яго ў такіх грахах, як субкультурнасць, адсутнасць дакладных арганізацыйных стратэгіяў, залішняя палітызаванасць, няздольнасць вызначыць місію і сканцэнтравацца на пэўных мэтавых групах, зацыкленасць на “змене рэжыму” замест “змены свядомасці” грамадзянаў.

Арганізацыя можа паспяхова рэалізаваць шэраг сваіх праектаў, але ці спрыяюць гэтыя праекты таму, каб тое, што складае сэнс існавання арганізацыі ці групы, зрабілася рэчаіснасцю – гэта ўжо пытанне зусім не мэнэджэрскага плану. Забягаючы наперад, трэба сказаць, што акурат гэта можна вынесці з апытання беларускіх НДА, якія, незалежна ад іх арыентацыі, інстытуцыяналізацыі ці крыніцаў фінансавання, прыкладна аднолькава падыходзяць што да крытэраў эфектыўнасці самой працы – у гэтым аспекце яны перш за ўсё арыентуюцца на дасягненне мэтаў пастаўленых самой арганізацыяй, а не задавальненне патрэбаў той ці іншай мэтавай аўдыторыі.

З іншага боку, працэсы дэмакрытызацыі ў Беларусі спавадуе не тое, што адна ці некалькі НДА прыйдуць да пэўных паспяховых уласных індывідуальных стратэгіяў, а новая якасць грамадзянскай супольнасці і ўсяго грамадства. Таму ў сваім аналізе аўтар паспрабуе развесці арганізацыйную эфектыўнасць арганізацыі і выніковасць усяго сектару. Аналізуючы, як арганізацыі адчуваюць сябе і ацэньваюць уласную эфектыўнасць, будзе зроблена спроба прааналізаваць, ці звязана гэтая самаацэнка з накіраванасцю арганізацыі на дэмакратычныя змены і на тыя віды дзейнасці, што іх прасоўваюць.

Нарэшце, можна вызначыць яшчэ адно абмежаванне, нават калі яно аблягчае працу аўтара. Ініцыятары і распрацоўшчыкі даследавання спецыфічна сканцэнтраваліся на сектары НДА як адной з праяваў грамадзянскай супольнасці. Гэта звужае аб’ект аналізу, але ў той жа час зацяжарвае больш грунтоўную размову пра грамадзянскую супольнасць, толькі часткай якой з’яўляюцца структурызаваныя НДА.[6] Упор на арганізацыйнае будаўніцтва не заўжды ўлічвае той факт, што арганізацыі складаюцца з людзей. Іх фармаванне як асобаў, развіццё, перамогі і расчараванні ў іх дзейнасці адбываюцца не толькі паралельна з прыватным і паўсядзённым жыццём грамадскіх актывістаў, але і сталі неад’емнай часткай іх жыцця. Не бачыць менавіта гэтага аспекту – паўсядзённага чалавечага жыцця - значыць разглядаць грамадзянскую супольнасць асобна ад уласна кажучы грамадзянаў. Зрэшты, багаты факталагічны матэрыял дазваляе схіліць наш аналіз менавіта ў гэты бок. Урэшце рэшт, казаць пра арганізацыйную эфектыўнасць без моцных унутраных матывацыяў да грамадскай дзейнасці не выпадае, а ў выпадку барацьбы за дэмакратыю з аўтарытарным ладам – тым больш.

---

[6] Чаму НДА – гэта яшчэ не грамадзянская супольнасць, глядзі Thomas Carothers. “Think Again: Civil Society.” Foreign Policy Magazine, Winter 1999-2000 http://www.globalpolicy.org/ngos/civsoc.htm

## АНАЛІЗ ПАГЛЫБЛЕНЫХ ІНТЭРВ’Ю

Аналіз паглыбленых інтэрв’ю прадстаўляў зацікаўленасць перш за ўсё магчымасцю больш дэтальнага вывучэння кантэксту і пэўных аспектаў грамадскай працы ў Беларусі, які не заўжды “схопліваецца” статыстычнымі метадамі. Акрамя таго, у матэрыялах інтэрв’ю даецца “расшыфроўка” тых ці іншых дылемаў, што паўстаюць у працы і паўсядзённым жыцці грамадскіх актывістаў, і вылучаюцца пэўныя гіпотэзы, якія можна будзе потым праверыць на большым масіве дадзеных. У сваім аналізе аўтар сканцэнтраваўся на наступных акалічнасцях:

1. Матывацыя прыходу ў грамадскую дзейнасць.
2. Сумяшчэнне грамадскай дзейнасці і іншых аспектаў паўсядзённага жыцця.
3. Самаацэнка ўласных дзеянняў

### Адкуль бяруцца НДАшнікі

З дадзеных апытання гэтаксама як і з інтэрв’ю з лідэрамі грамадзянскай супольнасці выцякае, што значная частка грамадскіх арганізацый, што існуюць у Беларусі, паўсталі ў два адметныя часавыя прамежкі: першы – 1989-1991 гады (пікавы перыяд “перабудовы”), другі – у 1996-1997 гады (падчас вядомых падзеяў, якія скончыліся паваротам да аўтарытарнай сістэмы). У абодвух выпадках паўстанне НДА было адказам актыўнай часткі грамадства на працэсы, якія адбываліся ў краіне.

У людзей, якія прыходзілі ў грамадскі сектар, была даволі акрэсленая матывацыя. Першая хваля, якая прыйшла ў 1980-х гг., відавочна была “абуджаная” перабудовай і імкнулася скарыстацца з новых магчымасцяў (напрыклад, “пазнаць сусвет”), якія адкрывала для іх палітычная адкрытасць. Таксама гэта была своеасаблівая форма пратэсту супраць савецкай рэчаіснасці. Заўважна, што ў гэтай хвалі было даволі шмат “масавікоў-зацейнікаў” і “общественников” савецкага часу, якія імкнуліся раскрыць свой патэнцыял і павялічыць сацыяльны капітал. Менавіта самарэалізацыя была другім па важнасці пабуджальным матывам далучэння да незалежнай грамадскай актыўнасці, бо ў той час (у абодва часавыя прамежкі), удзел у НДА адкрываў большыя далягляды, магчымасці і перспектывы, чым падтрыманне хісткага і нетрывалага кантракта з дзяржавай.

З аналізу траекторыяў “прыходу” ў актыўную грамадскую дзейнасць можна зрабіць дзве важныя высновы. Па-першае, грамадзянская супольнасць першапачаткова генетычна афармлялася ў Беларусі як адметная субкультура неабыякавых і амбітных людзей у патрыярхальна-суб’ектнай палітычнай культуры. Субкультурнасць як грамадзянскай супольнасці ў цэлым, так і апазіцыі ў прыватнасці часцяком ставіцца гэтым асяродкам у пасіў (маўляў, страшна далёкія яны ад народа). Аднак, такі падыход – гэта прыкладна тое ж, што абвінавачваць здаровыя клеткі арганізму ў тым, што яны не здолелі перамагчы ракавую пухліну. Здаровыя клеткі прайграюць менавіта таму, што іх мала, а не таму, што яны не спрабуюць выпрацаваць імунітэт! Па-другое, аналізуючы генезіс беларускага трэцяга сектару па глыбінных інтэрв’ю з яго лідэрамі, нельга пагадзіцца з распаўсюджаным стэрэатыпам, што НДА сталі проста формай існавання і фінансавай падпіткі палітычнай апазіцыі. Наадварот, як выцякае з інтэрвью, працэс палітызацыі беларускага трэцяга сектару – гэта шмат у чым працэс вымушанага ўвязвання ў палітыку першапачаткова “траваядных” грамадзянскіх ініцыятываў. І ўжо потым грамадская дзейнасць, якая пачыналася для многіх як “пакліканне”, паступова ператварылася ў прафесію.

Калі прыход у грамадскі сектар быў справай выбару, то заставацца ў ім стала неабходнасцю, ці нават вымушаным крокам. Такое становішча часцяком называецца

“path dependency”, што можна вольна перакласці як “пастка выбару”. У нейкай крытычнай кропцы (critical juncture) чалавек ці група робіць пэўны выбар, наступствы якога “замыкаюць” яго на пэўным жыццёвым шляху: напрыклад, мы можам зрабіць у 18 год выбар на карысць нейкай кар’еры, які ў 30 год, пасля інвеставання часу і высілкаў, перайначыць будзе ўжо немагчыма. Што вельмі важна, гэты момант крытычнай кропкі ў персанальных траекторыях грамадзянскіх актывістаў супаў з “крытычнай кропкай” у развіцці краіны ў цэлым.

Зыходзячы з адказаў на пытанні, можна зрабіць некалькі высноваў пра сумяшчэнне дзейнасці ў НДА з больш шырокім кантэкстам паўсядзённага жыцця.

1. Сыход у грамадскі сектар паступова пачаў азначаць шлях канфрантацыі з афіцыйным грамадствам. Пэўнае “time sharing” – сумяшчэнне працы ў дзяржаўным і грамадскім сектарах – было магчыма прыкладна да пачатку 2000-х гг. Аднак, такі выбар з большага азначаў, што чалавек паступова адразаў сабе – ці, больш дакладна, яму адразалі – шлях вяртання ў “афіцыйнае грамадства”, кантакты з якім працягваліся на ўзроўні пашпартных сталоў, паходаў у крамы і г.д. Таму паступова год за годам НДА ператваралася не толькі ў месца працы, але і ў сродак выжывання.

2. Тыя ж самыя чыннікі праграмуюць пэўныя кадравыя праблемы у грамадскім сектары, на якія спасылаюцца шмат хто з апытаных. Прычына гэтых праблемаў не ў тым, што грамадскія актывісты не жадаюць вучыцца ці набываць новыя навыкі, ці мяняць свае адносіны да працы, а зусім у іншым. З пункту гледжання гіпотэзы пра “пастку выбару”, у НДА сектар прыйшлі ў асноўным ідэялісты. Мэнэджэры – прагматыкі або разлічылі сітуацыю і ўвайшлі ў кантракт з дзяржавай, або з’ехалі з краіны на ўсе чатыры бакі. Грамадская арганізацыя ў Беларусі не можа пайсці ў агенцтва па найму, калі патрэбны пэўны працаўнік з пэўнымі кампетэнцыямі. Таму знайсці добрага мэнэджэра НДА – праблема яшчэ больш складаная, чым колішняму старшыні саўгаса “Гарадзец” было знайсці даярку на ферму. Таму многія НДА вымушаны працаваць з тымі, хто застаўся ў сектары – прычым па азначэнні часта гэта людзі не мэнэджэрскага складу (шмат каго ў сектары ўтрымліваў ідэялізм, які не заўжды сумяшчальны з рацыянальным мысленнем). Як казаў бы Сталін, у нас проста няма іншых пісьменнікаў.

3. Адказам на дэфіцыт кампетэнцый з’яўляецца, як гэта не парадаксальна, гіперпрафесіяналізацыя беларускіх НДА. У тэорыі, незалежная грамадская актыўнасць можа набываць разнастайныя формы. Чалавек не мусіць аддаваць гэтай справе ўвесь свой час – можна ахвяраваць некалькі гадзінаў на тыдзень. Ён ці яна не абавязкова мусіць займацца юрыдычнымі і фінансавымі пытаннямі – можна стварыць і кіраваць вялізнай арганізацыяй, але і рэгулярныя трэніроўкі дваравой футбольнай каманды – гэта таксама форма нармальнай грамадскай актыўнасці. У беларускай практыцы, аднак, пад цяжарам абставінаў, незалежная грамадская актыўнасць набыла амаль выключна форму НДА (ці амаль выключна гэтая форма прыцягвае ўвагу). Паколькі арганізацыйная форма вызначае змест, то падтрыманне яе вымагае даволі шырокі набор высілкаў і кампетэнцыяў. Пры ўмовах недахопу кадраў, тым жа самым людзям трэба ўмець самыя розныя рэчы – да гэтага дадаюцца абставіны палітычнага ўсціску.

Гіперпрафесіяналізацыя – магчыма неабходная перадумова выжывання грамадскага сектару ў сучаснай Беларусі. Аднак менавіта гэта звужае (ці проста з’яўляецца вынікам звужэння) поле незалежнай грамадскай актыўнасці да “прафесійных” НДА, і “замыкае” ў сектары людзей, якія пры іншых абставінах даўно б ужо адтуль сышлі.

Большасць апытаных лічаць сябе “адбыўшыміся” лідэрамі – хоць трапляюцца і вельмі самакрытычныя ацэнкі. Аднак, у той жа час, лідэры вельмі крытычна ацэніваюць стан сектару ў цэлым. Згодна з сукупным пунктам гледжання, эфектыўных арганізацый у

Беларусі не больш за дзесяць адсоткаў. Пры гэтым, крытэры эфектыўнасці даволі размытыя, што з большага прадказальна.

### Што робіць грамадзянскую супольнасць эфектыўнай

Лідэры незалежнага грамадскага сектару амаль аднадушна пагаджаюцца, што пытанне пра эфектыўнасць беларускіх НДА адэкватна нават у тых палітычных умовах, у якіх вядзецца іх дзейнасць. Аднак, крытэры эфектыўнасці дастаткова размытыя. Можна сустрэць дзве магчымыя трактоўкі паняцця эфектыўнасці – адна, гэта дасягненне арганізацыяй тых мэтаў, якія яна перад сабой ставіць. Другая – гэта выкананне місіі арганізацыі. Але тут мы сутакаемся з парадоксам. Беручы пад увагу палітычную сітуацыю ў краіне, лідэры НДА не могуць задаволіцца ўласнымі дасягненнямі, нават калі яны задаволены вынікамі дзейнасці ўласнай арганізацыі (а большасць, як выцякае з глыбінных інтэрвью, сапраўды задаволеныя). НДА не займаюцца самападманам, бачачы рэчаіснасць узмацнення ў дачыненні да іх рэпрэсій. У той жа час незразумела, ці "абмежаваная" місія арганізацыі можа быць навогул дасягнутая ва ўмовах палітычнай несвабоды. Пытанне ў тым, што ні лідэрам НДА, ні "тэарэтыкам" дэмакратыі не зразумела да канца, ці вядуць (і якім чынам) адносна абмежаваныя ў прасторы і часе праекты і кампаніі да запаветнай мэты. Як калісьці вызначыў аўтар гэтых радкоў, "няма ліхтара ў канцы тунелю, няхай самага хісткага і слабенькага. Няма кропкі на гарызонце, якую бачылі б партыйныя і беспартыйныя, арганізаваныя і неарганізаваныя, працуючыя ў рэале і ў віртуале, тыя, хто жыве ў Менску, у рэгіёнах і за мяжой. Няма нават маленькай, хай і не зусім рэальнай, але структурызаванай надзеі".

Аналізуючы змест інтэрв'ю, можна прыйсці да вылучэння некаторых гіпотэзаў:

1. Ва ўмовах палітычнага ціску, павышэнне ўласнай эфектыўнасці арганізацый проста можа не з'яўляцца дамінуючай матывацыяй грамадскай дзейнасці. Нават больш моцная арыентацыя – на самазахаванне - цягне за сабой самаабмежаванне ў мэтах і сродках. Болей за тое, самазахаванне вядзе да дзеянняў, якія супярэчаць патрэбам арганізацыйнага развіцця і распаўсюду сваёй дзейнасці на мэтавыя групы. Напрыклад, некаторыя рэспандэнты проста казалі, што іх арганізацыі мусяць "не піярыцца".

2. Тэндэнцыя да вызначэння самазахавання як прыярытэту нясе з сабой не толькі абмежаванне магчымасцяў, але і разбурэнне сацыяльнага капіталу НДА. Ва ўмовах пастаяннай напружанасці нівелюецца галоўная якасць самаарганізаванага грамадства – міжасабовы давер.

3. Грамадская дзейнасць у "траваядным" фармаце безумоўна асацыюецца з большым задавальненнем ад поспехаў і большай самаацэнкай. Аднак, акурат яна найменш арыентуецца на бесканфліктныя ў дачыненні да палітычных рэаліяў формы і мэты дзейнасці.

4. Традыцыйныя ацэнкі арганізацыйнай эфектыўнасці не ўлічваюць усіх аспектаў працы грамадскага сектару. Магчыма, больш важным крытэрам эфектыўнасці ёсць не колькасць тых, хто быў закрануты тымі ці іншымі дзеяннямі, але тое, наколькі дзейнасць НДА прывяла да якасных зменаў у псіхалогіі і памкненнях таго ці іншага чалавека.

## ВЫНІКІ САЦЫЯЛАГІЧНАГА АПЫТАННЯ

У сваім аналізе аўтар шукаў адказы на пастаўленыя ініцыяттарамі даследавання пытанні праз спробу выявіць заканамернасці ў арганізацыйных практыках і самаадчуванні (у першую чаргу ацэнцы ўласнай эфектыўнасці на аснове арганізацыйнага досведу) сярод розных тыпаў беларускіх НДА. Рабілася спроба высветліць адметнасці “траваяднага” і “платаяднага” НДА-сектару праз аналіз адказаў на пытанні прадстаўнікамі арганізацыяў у залежнасці ад 1) наяўнасці ў іх рэгістрацыі 2) важнасці працы на дасягненне дэмакратычных зменаў у краіне для дадзенай арганізацыі. Акрамя таго, практыкі і настроі ў НДА сектары аналізаваліся ў залежнасці ад таго, ці атрымліваюць арганізацыі грантавае фінансаванне ці бюджэтную падтрымку. Калі працягваць алегорыю з класамі сусветнай фауны, гэтыя групы арганізацый могуць быць пазначаныя ў даследванні адпаведна як “птушкі”-грантаатрымальнікі і “гады”-GoNGOs.  У другой частцы аналізу аўтар прасачыў тыя ж самыя тэндэнцыі (практыкі і настроі) ў залежнасці ад ацэнкі эфектыўнасці як уласнай арганізацыі, так і ўсяго НДА сектару. Акрамя таго, для ўдакладнення дадзеных, былі выдзелены два тыпы арганізацый, якія падаюцца найбольш цікавымі для мэтаў даследавання. Абодва тыпы – гэта арганізацыі, якія лічаць сваю дзейнасць эфектыўнай. Розніца ў тым, што першы тып – гэта арганізацыі, якія лічаць дасягненне дэмакратчыных зменаў важным складнікам сваёй дзейнасці, другі – гэта тыя, якія так не лічаць.

Трошкі больш за палову прадстаўнікоў НДА сектару працуюць у ім, як кажуць, “на поўную стаўку” ці амаль на яе. Сярод “дэмакратаў” гэты адсотак некалькі вышэйшы, але выглядае, што галоўным чыннікам прафесіяналізацыі з’яўляецца доступ да ўстойлівага знешняга фінансавання – незалежна ад таго, ці гэта “птушкі” ці “гады”. Таксама бачна, што прафесіяналізацыя станоўча ўплывае на ацэнку эфектыўнасці як самой арганізацыі, так і ўсяго сектару, асабліва сярод дэмакратычна арыентаваных арганізацый. Аднак, тут гутарка можа ісці і пра паўстанне пэўнага карпаратыўнага духу – кулікі пачынаюць хваліць уласнае балота.

Табліца 1. Ці з’яўляецца грамадская дзейнасць асноўным відам дзейнасці?

| | Зарэгістраваныя | Незарэгістраваныя | “Дэмакраты” | “Аналітычныя” | Атрымліваюць гранты | Не атрымліваюць грантаў | Падтрымліваюцца дзяржавай | Не падтрымліваюцца дзяржавай | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так і хутчэй так | **53** | 44,8 | **55,7** | 38,6 | **67** | 36,5 | **64,3** | 48,5 | **51,0** |

| | Лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Не лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Не лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Дэмакратычна арыентаваная, лічыць сябе эфектыўнай | Абыякавая да дэмакратыі, лічыць сябе эфектыўнай | У сярэднім |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так і хутчэй так | **54,7** | 44,1 | **56,6** | 44 | **58,8** | 43,6 | **51,0** |

Тая ж самая тэндэнцыя відавочна і калі прааналізаваць наяўнасць вызваленых чалавечых рэсурсаў: Наяўнасць штату у першую чаргу – рыса “гадаў” і зарэгістраваных арганізацый, адсутнасць магчымасцяў прыцягнуць вызваленых работнікаў уплывае негатыўна як на ацэнку эфектыўнасці ўласнай працы, так і сектару ў цэлым.

Табліца 2. Штат у арганізацыі

| | Зарэгістраваныя | Незарэгістраваныя | “Дэмакраты” | “Аналітычныя” | Атрымліваюць гранты | Не атрымліваюць грантаў | Падтрымліваюцца дзяржавай | Не падтрымліваюцца дзяржавай | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Не | 41 | **61** | 45 | 50 | 45 | 46 | **20** | 51 | **46** |
| Так | **58** | 38 | 54 | 50 | 54 | 54 | **78** | 48 | **54** |

| | Лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Не лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Не лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Дэмакратычна арыентаваная, лічыць сябе эфектыўнай | Абыякавая да дэмакратыі, лічыць сябе эфектыўнай | У сярэднім |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Не | 41 | **63** | 40 | 53 | 40 | 47 | **46** |
| Так | 57 | 36 | 60 | 47 | 59 | 53 | **54** |

Трошкі іншая тэндэнцыя назіраецца, калі прааналізаваць адданасць актывістаў працы. З аднаго боку, толькі сярод "гадаў" адказ на пытанне, які адсотак ад сябраў вашай арганізацыі актыўна ўдзельнічае ў дзейнасці, значна перавышае сярэдні паказчык. Аднак, у той жа час, колькасць "прагульшчыкаў" таксама мінімальная ў незарэгістраваных арганізацыяў. Трошкі больш распаўсюджаны абсэнтызм сярод зарэгістраваных арганізацыі і "птушак". Цікава, што колькасць актыўна ўдзельнічаючых сябраў арганізацыі амаль ніяк не ўплывае на самаацэнку эфектыўнасці як самой арганізацыі, так і сектару ў цэлым.

Табліца 3. Працэнт сяброў арганізацыі, якія актыўна ўдзельнічаюць у дзейнасці

| | Зарэгістраваныя | Незарэгістраваныя | "Дэмакраты" | "Апалітычныя" | Атрымліваюць гранты | Не атрымліваюць грантаў | Падтрымліваюцца дзяржавай | Не падтрымліваюцца дзяржавай | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Да 25% | **33** | **15** | 28 | 32 | **33** | 28 | **16** | 32 | 29 |
| Да 50% | 31 | 41 | 34 | 32 | 37 | 33 | 27 | 35 | 34 |
| Да 75% | 12 | 15 | 12 | 13 | 10 | 13 | 13 | 12 | 12 |
| Да 100% | 24 | **30** | 27 | 22 | **20** | 27 | **44** | 22 | 25 |

| | Лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Не лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Не лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Дэмакратычна арыентаваная, лічыць сябе эфектыўнай | Абыякавая да дэмакратыі, лічыць сябе эфектыўнай | У сярэднім |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Да 25% | 29 | 29 | 32 | 28 | 28 | 33 | 29 |
| Да 50% | 32 | 39 | 29 | 37 | 32 | 30 | 34 |
| Да 75% | 13 | 12 | 15 | 10 | 12 | 13 | 12 |
| Да 100% | 26 | 20 | 24 | 26 | 28 | 24 | 25 |

Прымаючы да ўвагі кампанію па ліквідацыі грамадскіх арганізацый, якая ішла амаль усю мінулую пяцігодку, можна ўспрыняць як абнадзейваючы факт тое, што толькі адна пятая частка НДА пацвердзіла зніжэнне колькасці сябраў сваіх арганізацыяў, што не выглядае парадаксальным – тыя, хто здолеў выжыць, выжылі таму, што захавалі актыў. Найбольшыя кадравыя праблемы, зноў такі прадказальна, ў незарэгістраваных арганізацый, ціск супраць якіх быў выведзены на ўзровень крымінальнага кодэксу. У астатнім палітычны напрамак арганізацыі, яе сувязі з уладай ці грантадаўцамі, толькі мінімальна уплываюць на лаяльнасць сябраў НДА да грамадскай справы. А вось узаемасувязь паміж лаяльнасцю і ацэнкай эфектыўнасці працы арганізацый больш чым відавочная.

Табліца 4. За апошні час колькасць сяброў вашай арганізацыі

| | Зарэгістраваныя | Незарэгістраваныя | "Дэмакраты" | "Апалітычныя" | Атрымліваюць гранты | Не атрымліваюць грантаў | Падтрымліваюцца дзяржавай | Не падтрымліваюцца дзяржавай | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Павялічылася | **36** | **26** | 32 | 34 | 30 | 33 | **36** | 32 | **32** |
| Паменшылася | 20 | **29** | 22 | 20 | 25 | 22 | **11** | 24 | 22 |
| Засталася ранейшай | 41 | 46 | 42 | 44 | 43 | 42 | 50 | 41 | 42 |

| | Лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Не лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Не лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Дэмакратычна арыентаваная, лічыць сябе эфектыўнай | Абыякавая да дэмакратыі, лічыць сябе эфектыўнай | У сярэднім |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Павялічылася | **37** | **15** | 38 | 27 | 37 | 38 | 32 |
| Паменшылася | 18 | 31 | 21 | 25 | 17 | 17 | 22 |
| Засталася ранейшай | 43 | 40 | 39 | 44 | 43 | 44 | 42 |

## 2. Матывацыя грамадскай актыўнасці

У дэмакратаў, грантаатрымальнікаў і незарэгістраваных арганізацый відавочна дамінуюць "індывідуальныя" матывацыі, напрыклад, самарэалізацыя, а таксама "глабальныя" – то бок імкненне змяніць сітуацыю ў краіне "ў цэлым". Таксама відавочна поўная абыякавасць да гэтых памкненняў сярод тых, хто не бачыць грамадскую дзейнасць сродкам дасягнення нейкіх палітычных зменаў. Аднак у той жа час, "дэмакраты" і апалітычныя грамадскія актывісты прыкладна ў роўнай ступені матывуюцца імкненнем вырашыць канкрэтную праблему ці дапамагчы іншым людзям. Цікава, што тыя, хто матываваўся найперш "асабістымі" ці "глабальнымі" памкненнямі, найбольш і расчараваліся грамадскай дзейнасцю. Магчыма, гэтыя людзі па сваёй натуры больш палітызаваныя, і менавіта дасягненне палітычных зменаў ёсць для іх крытэрам рэалізацыі ўласнага патэнцыялу. Аднак, гэтаму можа быць дадзена і іншае тлумачэнне, якому, дарэчы, можна знайсці доказы ў глыбінных інтэрвью. Тыя, хто ішоў у грамадскі сектар дзеля самарэалізацыі – гэта людзі з надзвычай высокімі амбіцыямі і запытамі. Яны звычайна дамагаюцца шмат у сваім жыцці, але застаюцца незадаволенымі, разумеючы, чаго яны маглі б дамагчыся і не здолелі (калі гэта так, можна толькі здагадвацца пра распаўсюджанасць няўрозаў сярод незалежнага грамадства). Тут варта ўзгадаць, што незадаволенасць часта з'яўляецца лепшым стымулам любой дзейнасці.

Табліца 5. Асноўны матыў у стварэнні арганізацыі

| | **Зарэгістраваныя** | **Незарэгістраваныя** | **"Дэмакраты"** | **"Апалітычныя"** | **Атрымліваюць гранты** | **Не атрымліваюць грантаў** | **Падтрымліваюцца дзяржавай** | **Не падтрымліваюцца дзяржавай** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Самарэалізацыя | 22 | 33 | **28** | **13** | **28** | 23 | 20 | 25 | **24** |
| Імкненне дапамагчы сябрам арганізацыі | 39 | 31 | 37 | 35 | 37 | 37 | 37 | 37 | 37 |
| Імкненне паўплываць на ход пераўтварэнняў у краіне | 32 | **51** | **49** | 12 | **45** | 34 | **20** | **40** | 37 |
| Імкненне вырашыць канкрэтную праблему | 44 | **51** | 47 | 41 | **59** | 42 | 41 | 47 | 46 |
| Імкненне дапамагчы іншым людзям | **55** | 47 | 52 | 52 | **58** | 51 | 54 | 52 | 53 |

| | **Лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай** | **Не лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай** | **Лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным** | **Не лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным** | **Дэмакратычна арыентаваная, лічыць сябе эфектыўнай** | **Абыякавая да дэмакратыі, лічыць сябе эфектыўнай** | **У сярэднім** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Самарэалізацыя | 23 | **35** | 18 | 32 | 26 | **13** | 24 |
| Імкненне дапамагчы сябрам арганізацыі | 37 | 38 | 40 | 33 | 37 | 38 | 37 |
| Імкненне паўплываць на ход пераўтварэнняў у краіне | 34 | **47** | 30 | 48 | 45 | **10** | 37 |
| Імкненне вырашыць канкрэтную праблему | 43 | 48 | 47 | 45 | 47 | 40 | 46 |
| Імкненне дапамагчы іншым людзям | 53 | **41** | **58** | 45 | 52 | 57 | 53 |

Што найбольш замінае ў дзейнасці арганізацыі? Большасць апытаных узгадалі праблему фінансавання ў розных яе аспектах (атрыманне фінансавых сродкаў, магчымасць арэнды памяшкання і г.д.), прычым найменш гэтыя праблемы адзначаюць менавіта ў лагеры "дэмакратаў", што і невыпадкова – пытанне хутчэй імкнулася высвеціць актуальнасць адной праблемы адносна іншых. У той жа час,

грошай больш за ўсё не хапае тым арганізацыям, якія падтрымліваюцца... дзяржавай. Цікава, што пры тым, што ўласны стан арганізацыі не выглядае як праблема для большасці НДА, яна ўсё ж трошкі больш актуальная для сябраў НДА, якія атрымліваюць гранты. Таксама варта заўважыць, што пагаршэнне адносінаў з уладамі негатыўна ўплывае на ацэнку эфектыўнасці дзейнасці арганізацый, хаця дэмакратычныя арганізацыі, якія здолелі дасягнуць эфектыўнасці ў сваёй дзейнасці, канфліктуюць з уладамі больш, чым чым сярэднястатыстычнае НДА.

Табліца 6. Найбольшая праблема ў дзейнасці арганізацыі

| | **Зарэгістраваныя** | **Незарэгістраваныя** | **"Дэмакраты"** | **"Апалітычныя"** | **Атрымліваюць гранты** | **Не атрымліваюць грантаў** | **Падтрымліваюцца дзяржавай** | **Не падтрымліваюцца дзяржавай** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Звязаныя з фінансаваннем | 44 | **29** | 37 | 47 | **29** | 44 | **52** | 38 | 40 |
| Звязаныя з уладай | 26 | **47** | 39 | 14 | **42** | 28 | **20** | 34 | 31 |
| Звязаныя з унутраным станам арганізацыі | 6 | 6 | 7 | 6 | 9 | 6 | 1 | 8 | 7 |
| Іншае | 22 | 16 | 17 | **32** | 20 | 21 | 26 | 20 | 21 |

| | **Лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай** | **Не лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай** | **Лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным** | **Не лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным** | **Дэмакратычна арыентаваная, лічыць сябе эфектыўнай** | **Абыякавая да дэмакратыі, лічыць сябе эфектыўнай** | **У сярэднім** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Звязаныя з фінансаваннем | 43 | 32 | 48 | 32 | 39 | **50** | 40 |
| Звязаныя з уладай | 30 | 36 | 25 | 38 | 36 | **16** | 31 |
| Звязаныя з унутраным станам арганізацыі | 6 | **12** | 5 | **10** | 6 | 5 | 7 |
| Іншае | 21 | 19 | 21 | 19 | 19 | 28 | 21 |

Абсалютная большасць рэспандэнтаў упэўнена, што іх арганізацыі не знікнуць і працягнуць працаваць, прычым прыкладна чвэрць нават мяркуе, што яны нават здолеюць пашырыць сваю дзейнасць. У гэтым аспекце "міжкласавыя" адрозненні мінімальныя, хаця цікава, што сярод удзельнікаў незарэгістраваных НДА больш як заўзятых песімістаў, так і аптымістаў – колькасць тых, хто разлічвае на пашырэнне дзейнасці такая ж, як і сярод сяброў НДА, якія падтрымліваюцца дзяржавай. Нізкая самаацэнка дзейнасці карэлюе з песімізмам у адносінах да пашырэння ўласнай дзейнасці, але што цікава – само па сабе памкненне да пашырэння дзейнасці не ёсць крытэрам да падвышанай самаацэнкі ў грамадскай дзейнасці. Калі гэтая самаацэнка супадае з рэчаіснасцю, то эфектыўныя НДА бяруць, як гаворыцца, не колькасцю, а якасцю.

Табліца 7. Праз 3 гады, ваша арганізацыя...

| | **Зарэгістраваныя** | **Незарэгістраваныя** | **"Дэмакраты"** | **"Апалітычныя"** | **Атрымліваюць гранты** | **Не атрымліваюць грантаў** | **Падтрымліваюцца дзяржавай** | **Не падтрымліваюцца дзяржавай** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Спыніць дзейнасць | 6 | **15** | 7 | 4 | 5 | 9 | 2 | 10 | 8 |
| Зменшыць дзейнасць | 5 | 7 | 6 | 5 | 5 | 5 | 6 | 5 | 5 |
| Застанецца на тым жа ўзроўні | 39 | 34 | 38 | 36 | 39 | 38 | 43 | 37 | 38 |
| Пашырыць дзейнасць | 24 | **29** | 26 | 26 | 24 | 26 | **29** | 25 | 25 |

| | Лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Не лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Не лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Дэмакратычна арыентаваная, лічыць сябе эфектыўнай | Абыякавая да дэмакратыі, лічыць сябе эфектыўнай | У сярэднім |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Спыніць дзейнасць | 7 | **14** | 9 | 9 | 7 | 9 | 8 |
| Зменшыць дзейнасць | 4 | 13 | 8 | 6 | 3 | 5 | 5 |
| Застанецца на тым жа ўзроўні | 40 | 33 | 39 | 38 | 39 | 39 | 38 |
| Пашырыць дзейнасць | 28 | 19 | 26 | 23 | 28 | 28 | 25 |

Як пазітыўны момант можна адзначыць і тое, што, абсалютная большасць удзельнікаў грамадскага сектару ўпэўненыя, што асабіста яны самі працягнуць сваю дзейнасць і ў далейшым. Адсутнасць міжкласавай розніцы прыводзіць да высновы, што грамадскі сектар, незалежна ад яго праявы, паспеў стаць ужо не толькі відам дзейнасці, але і стылем жыцця (або "крыжам", які актывісты мусяць цягнуць праз усё жыццё).

Табліца 8. Ці збіраецеся вы і надалей удзельнічаць у грамадскім сектары

| | Зарэгістраваныя | Незарэгістраваныя | "Дэмакраты" | "Апалітычныя" | Атрымліваюць гранты | Не атрымліваюць грантаў | Падтрымліваюцца дзяржавай | Не падтрымліваюцца дзяржавай | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так і хутчэй так | 92 | 95 | 94 | 92 | 98 | 91 | 92 | 94 | **90** |

| | Лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Не лічаць сваю арганізацыю эфектыўнай | Лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Не лічаць грамадзянскі сектар эфектыўным | Дэмакратычна арыентаваная, лічыць сябе эфектыўнай | Абыякавая да дэмакратыі, лічыць сябе эфектыўнай | У сярэднім |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так і хутчэй так | 92 | 88 | 91 | 89 | 92 | 92 | **90** |

## 3.Практыкі грамадскай дзейнасці 1 – як?

Аналізуючы, чым займаюцца беларускія недзяржаўныя арганізацыі, можна акрэсліць дзве магчымыя катэгорыі заняткаў. Першая – гэта тое, чым займаюцца пераважна палітызаваныя і незарэгістраваныя арганізацыі. Гэта – ахова нацыянальнай культуры, гісторыя і краязнаўства, адукацыя, самаарганізацыя мясцовага насельніцтва, праваахоўная дзейнасць. Другі від дзейнасці – гэта тое, чым займаюцца тыя, хто ў палітыку, як кажуць, не лезе, або знаходзіцца пад крылом у дзяржавы. Тут дамінуюць розныя формы рэкрэацыйнай дзейнасці (спорт, турызм, мастацкая самадзейнасць, сацыяльныя праграмы, дабрачыннасць). Тут мы, здавалася б, бачым выключна выражаны разрыў паміж "траваяднай" і "платаяднай" парадыгмай, хоць ёсць некаторыя віды дзейнасці, якімі займаюцца ўсе, былі б грошы (напрыклад, сацыяльныя праекты, якія больш за астатніх ажыццяўляюць тыя, хто атрымлівае грошы, дзяржаўныя ці грантавыя). Можна, вядома, сказаць, што непалітызаваныя арганізацыі больш схільныя абіраць такія віды дзейнасці, якія маюць больш шанцаў закрануць максімальную колькасць бенефіцыяраў (хоць нельга сцвярджаць, што "дэмакраты" не імкнуцца гэтым займацца: пытання, чым бы вы хацелі займацца, не было зададзена ў анкеце). Аднак, у цэлым можна зрабіць выснову, што "дэмакраты" спрабуюць дагрукацца да сваёй аўдыторыі праз інтэлект (то бок, развіваюць такія формы дзейнасці, якія прымушаюць людзей думаць, займацца самаадукацыяй, прымаць рашэнні), у той час як непалітызаваныя арганізацыі наадварот імкнуцца даць людзям адпачыць ад залішніх думак. Няцяжка здагадацца, хто з іх будзе мець большы поспех. У той жа час нашмат цяжэй вызначыць, якая з гэтых стратэгіяў будзе больш спрыяць дэмакратызацыі Беларусі.

"Дэмакратычныя" формы грамадскай дзейнасці найчасцей асацыююцца з нізкай ацэнкай уласнай эфектыўнасці. Задавальненне атрымліваюць хіба што дэмакраты, якія шчыльна працуюць з людзьмі, займаючыся праваахоўнай дзейнасцю, або адукацыяй. Калі ж паглядзець на прадстаўнікоў непалітызаваных НДА, то здаецца, шлях да

пазітыўнага настрою зразумелы – спорт, турызм, дабрачыннасць, самадзейнасць, сацыяльныя праекты. Канешне, гэта не значыць, што, напрыклад, падвіжніцкая культурніцкая дзейнасць не з'яўляецца сацыяльна значнай – пласт нацыянальнай культуры зараз захоўваецца выключна дзякуючы фанатыкам – актывістам. І тое, што яны незадаволеныя сваёй дзейнасцю, сведчыць аб іх бяссіллі перад рэпрэсіўнымі дзеяннямі дзяржавы, у тым ліку разбуральнай палітыкай у галіне нацыянальнай культуры. Нізкая эфектыўнасць дзеянняў, канешне, яшчэ не сведчыць пра адсутнасць неабходнасці ў іх – гутарка можа проста ісці пра тое, што ў такіх сферах дзейнасці трэба прыкладаць мегавысілкі для таго, каб дасягнуць мінівынікаў. Але тут ёсць і нагода для "дэмакратаў", каб задумацца. Сфера забаваў, вольнага часу, паўсядзённага жыцця – ці дастаткова актыўны тут арганізацыі грамадзянскай супольнасці? Ці не патрэбны нават самым заўзятым змагарам перапынак на спорт і забавы? А калі сур'ёзна, то "дэмакратычным" НДА варта было б задумацца над тым, як знайсці больш шырокія, эфектыўныя (часам простыя) шляхі да людзей, каб тыя маглі зразумець і падтрымаць іх.

Табліца 9. Сфера дзейнасці вашай арганізацыі

| | **Зарэгістраваныя** | **Незарэгістраваныя** | **"Дэмакраты"** | **"Апалітычныя"** | **Атрымліваюць гранты** | **Не атрымліваюць грантаў** | **Падтрымліваюцца дзяржавай** | **Не падтрымліваюцца дзяржавай** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
